# ВІРТУАЛЬНЫЯ ДЫСКІ РОЗНЫХ ПРАВАЙДАРАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ Ў БДУІР

*А.В. Берастоўскі*

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», Мінск, Беларусь* berestovskij@bsuir.by

Abstract. The paper deals with the advantages and disadvantages of virtual drives such as Google Drive and Yandex Disk when these are used by a teacher of English to distribute local university material to students.

У мінулым годзе мы мелі магчымасць назіраць за тым, як з дапамогай віртуальных дыскаў розных правайдараў студэнты завочнай формы навучання і вячэрняга аддзялення БДУІР атрымоўваюць доступ да вучэбных матэрыялаў па англійскай мове. Як мы адзначалі ў нашай папярэдняй працы, прысвечанай гэтай тэме, большасць студэнтаў актыўна карыстаюцца ноўтбукамі, кішэннымі камп'ютарамі, планшэтамі, і мабільнымі тэлефонамі з доступам у Інтэрнэт і гэта новая рэалія дапамагае вырашыць адвечную праблему недахопу папяровых кніг і вучэбных дапаможнікаў для кожнага студэнта [1, 123-124]. У той жа працы мы далі больш падрабязнае апісанне таго, як рэзервовыя копіі вучэбных матэрыялаў (тэкставых, аўдыё і відэа) на віртуальных дысках сістэм Гугл, Яндэкс і сацыяльнай сеткі УКантакце дапамагаюць забяспечыць студэнтаў доступам да неабходнай інфармацыі. Няма патрэбы і прыводзіць падрабязнае апісанне ўсіх вядомых варыянтаў віртуальных дыскаў, даступных беларускаму карыстальніку Сеціва, з параўнаннем дасягненняў і недахопаў кожнага віду бо гэта ўжо зроблена спецыялістамі сферы ІТ.

Гэта праца з'яўляецца свайго роду фармалізацыяй вынікаў нашай практыкі карыстання такімі дыскамі ў вучэбным працэсе за апошнія некалькі год, і, у прыватнасці, у БДУІР. Так эмпірычна мы заўважылі некаторую перавагу магчымасцяў віртуальнага дыска ад Яндэкса над аналагічнымі прапановамі ад Гугл ці УКантакце: Яндэкс Дыск не патрабуе ад кожнага студэнта рэгістравацца ў сістэме ці ўсталёўваць пэўныя праграмы каб працаваць з матэрыялам настаўніка даступным па спасылцы, адпраўленай па e-mail ці праз сацыяльныя сеткі. Таму мы, вопытным шляхам, аддалі перавагу гэтаму правайдару. За 2014-15 навучальны год і першыя два месяцы 2015-16 н. г. матэрыялы па англійскай мове для студэнтаў-завочнікаў былі прагледжаны 590 раз і спампаваны 126 раз, а матэрыялы для вячэрнікаў ІІТ БДУІР былі прагледжаны 639 раз і спампаваны 326 раз. Гэта значыць, не толькі эканомію сродкаў на стварэнне папяровых матэрыялаў, але і больш цікавасці да матэрыялаў з боку студэнтаў, якія з большай ахвотай чытаюць з гаджэтаў, чым надрукаванае на паперы.

На цяперашні момант застаецца пытанні абароны матэрыялаў ад несанкцыянаванага доступу ці парушэння аўтарскіх правоў. Магчымым рашэннем гэтай праблемы можа стаць наяўнасць віртуальных дыскаў з рознымі ўзроўнямі доступу: агульны, які дазваляе карыстацца матэрыялам ан-лайн без рэгістрацыі, але без магчымасці спампаваць яго на камп'ютар ці смартфон і спецыялізаваны, які патрабуе рэгістрацыі і ўвахода ў сістэму для магчымасці пераносу матэрыялаў з віртуальнага дыску на здымны носьбіт ці цвёрды дыск камп'ютара.

### *Літаратура*

1. Берастоўскі А.В. Выкарыстанне віртуальных дыскаў у вучэбным працэсе. На прыкладзе выкладання англійскай мовы ў БДУІР // Материалы VII Международная научно-методическая конференции «Высшее техническое образование: проблемы и пути развития». Мн: БГУИР, 2014, с. 123-124.



Библиотека БГУИР